*ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!*

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

1980 г.
2 КАСТРЫЧНІКА
ЧАЦВЕР
№ 25 (1289)
Выходзіць раз у тыдзень.
Цана 2 кап.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

**ФОТАРЭПАРТАЖ З ПАСВЯЧЭННЯ ПЕРШАКУРСНІКАЎ У СТУДЭНТЫ**

## Шчаслівага шляху ў свет ведаў!

ПАСВЯЧЭННЕ Ў СТУДЭНТЫ... Урачысты і памятны для кожнага выхаванца БДУ імя Леніна дзень. Дзень, які злучае для першакурснікаў слаўнае мінулае, цяпер ужо роднага ім універсітэта, з будучым, у якім ім прадстаіць прадаўжаць яго традыцыі.

...Актавая зала універсітэта. Пятнаццаць гадзін. Гучыць урачысты марш, у прэзідыуме прадстаўнікі рэктарата і грамадскіх арганізацый універсітэта, дэканы факультэтаў, выкладчыкі. Уносяцца універсітэцкія сцягі. Вось яна, хвалюючая мінута: сакратар камсамольскай арганізацыі БДУ П. І. Брыгадзін дакладвае рэктару аб гатоўнасці першакурснікаў да ўрачыстага рытуалу — пасвячэння ў студэнты. Міжволі захапляе агульны настрой чакання нечага важнага, што зараз павінна адбыцца.

— Дарагія таварышы! Дазвольце мне ад імя праслаўленага 25-тысячнага калектыву Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна павіншаваць вас са знамянальнай падзеяй у вашым жыцці — паступленнем у вядучую ВНУ рэспублікі і пажадаць поспехаў, — з прывітальным словам звяртаецца да першакурснікаў рэктар БДУ імя У. І. Леніна акадэмік АН БССР У. А. Белы. — Сёння пачатак адной з самых лепшых старонак у вашым студэнцкім жыцці, і я думаю, што наколькі б цудоўным не было ваша дзяцінства, — гэта старонка будзе самай незабыўнай і цікавай. Рэктарат, кіраўніцтва універсітэта прыкладзе ўсе намаганні для таго, каб яна, гэта старонка, была сапраўды самай лепшай.



На жаль, у нас далёка не ўсе разумеюць асаблівую каштоўнасць і ролю універсітэцкай адукацыі, яе не параўнальныя ні з якой адукацыяй спецыфічныя асаблівасці, якія прадстаўляюць выпускнікам універсітэтаў вялікія магчымасці ў іх далейшай жыццёвай дзейнасці.

Універсітэты заўсёды стаялі, стаяць і будуць стаяць на вяршыні піраміды вышэйшай адукацыі, узвышаючыся над шматлікімі інстытутамі, якія рыхтуюць спецыялістаў больш вузкага профілю і не даюць сваім выпускнікам гэтак неабходных зараз і яшчэ больш неабходных у будучым шматгранных фундаментальных ведаў.

Універсітэты выконваюць асаблівую функцыю ва ўсёй сістэме вышэйшай адукацыі, бо яны больш за іншыя навучальныя установы адказныя за фарміраванне інтэлектуальнага патэнцыялу народа, за фарміраванне ідэй і стварэнне навуковых каштоўнасцей. Гэта лёгка пацвярджаецца хаця бы тым, што ў абсалютнай большасці вышэйшых навучальных устаноў кафедры, якія нясуць студэнтам веды па такіх фундаментальных навуках як марксісцка-ленінская філасофія, гісторыя партыі, матэматыка, фізіка, хімія, біялогія і іншыя камплектуюцца, як правіла, з выпускнікоў універсітэтаў. Ва ўсіх інстытутах Акадэміі навук, якія вядуць даследаванні па асноўных навуках, абсалютная большасць вучоных з'яўляюцца выпускнікамі універсітэтаў.

Спецыфічнай асаблівасцю універсітэцкай адукацыі з'яўляюцца сістэматычныя суадносіны і ўзаемаўзбагачэнне выкладчыкаў і студэнтаў розных навуковых кірункаў, чаго няма ў аднапрофільных ВНУ. Ва універсітэтах адбываецца бесперапынны, вельмі плённы працэс інтэграцый навук, у якім яны нібы «ўзаемазаражаюцца».

Універсітэты разам з акадэмічнымі інстытутамі заўсёды былі, ёсць і будуць калыскай фундаментальных даследаванняў.

Універсітэты сумяшчаюць у сабе функцыі вышэйшай навучальнай установы і акадэмічнага навуковага цэнтра, яны з'яўляюцца першымі праваднікамі прыродазнаўчых навук у гуманітарныя і наадварот.

Зараз, на жаль, яшчэ многія высокакваліфікаваныя спецыялісты даволі рэзка падзяляюцца на прадстаўнікоў тэхнічнай культуры і культуры гуманітарнай. Пераадолець разрыў паміж гэтымі дзвюма культурамі — адна з галоўных задач універсітэтаў, бо XXI стагоддзю патрэбны будуць людзі ўсебакова адукаваныя, прадстаўнікі адзінай культуры.

Адной з характэрных асаблівасцей выпускнікоў універсітэтаў з'яўляецца высокі ін-

(Заканчэнне на 2-й стар.).






## ВІНШУЕМ ЛАЎРЭАТАЎ

Бюро ЦК ЛКСМ Беларусі, разгледзеўшы прадстаўленні камісіі ЦК ЛКСМБ па прэміях Ленінскага камсамола Беларусі ў галіне навукі і тэхнікі, пастанавіла прысудзіць прэміі Ленінскага камсамола Беларусі і прысвоіць званне «Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі»:

1. ВЯТОХІНУ СЯРГЕЮ СЯРГЕЕВІЧУ — асістэнту кафедры агульнай фізікі Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна.

ГУЛАКОВУ ІВАНУ РАМАНАВІЧУ — дацэнту кафедры агульнай фізікі Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна, кандыдату фізіка - матэматычных навук — за работу «Распрацоўка і даследаванне сродкаў і метадаў рэгістрацыі слабых светлавых сігналаў».

2. СЛУКЕ АЛЕГУ ГЕОРГІЕВІЧУ — дацэнту кафедры гісторыі журналістыкі Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна, кандыдату гістарычных навук — за работы «Голас рэвалюцыйнай моладзі», «Слова ў рэвалюцыйным страі».

НАШЫ ЮБІЛЯРЫ

# Высакародны абавязак

НЯДАЎНА споўнілася 75 гадоў з дня нараджэння і 50 гадоў навукова - педагагічнай і грамадскай дзейнасці аднаго са старэйшых выхаванцаў нашага універсітэта, загадчыка кафедры радыётэхнікі і фізічнай электронікі факультэта радыёфізікі і электронікі прафесара Ільі Рыгоравіча Некрашэвіча. Паступіўшы ў 1923 годзе на фізіка - матэматычнае аддзяленне педагагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта, Ілья Рыгоравіч цалкам звязаў свой лёс з універсітэтам, прайшоўшы шлях ад студэнта да прафесара, загадчыка кафедры, заслужанага дзеяча навукі БССР.

Пасля паспяховага заканчэння універсітэта і аспірантуры пры Маскоўскім універсітэце, з 1930 года ён працуе на выкладчыцкай рабоце ў БДУ імя У. І. Леніна спачатку на пасадзе асістэнта, а потым дацэнта той жа кафедры. З 1937 года нязменна загадвае кафедрай агульнай фізікі, ад якой па меры роста і развіцця універсітэта пастаянна адпачкоўваліся многія кафедры цяперашняга фізічнага і радыёфізічнага факультэтаў. Сама кафедра агульнай фізікі, кіруемая І. Р. Некрашэвічам, перайменавалася ў кафедру агульнай фізікі і фізічнай электронікі і, нарэшце, радыётэхнікі і фізічнай электронікі.

З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны І. Р. Некрашэвіч стаў членам падпольнай камуністычнай арганізацыі Мінска (група М. Б. Восіпавай), а з 1943 года ўвайшоў у састаў партызанскага атрада. За ўдзел у партызанскім руху ўзнагароджаны медалём «Партызану Вялікай Айчыннай вайны 1 ступені» і медалямі: «За адвагу» і «За перамогу над Германіяй».

Пасля вызвалення Мінска ад нямецкіх захопнікаў І. Р. Некрашэвіч вярнууся ва універсітэт і зноў стаў працаваць загадчыкам кафедры агульнай фізікі, аддаючы шмат сіл і энергіі аднаўленню фізічных лабараторый.

На працягу ўсяго перыяду работы ва універсітэце І. Р. Некрашэвіч актыўна займаецца навуковай дзейнасцю. Яго першыя даследаванні ў галіне радыёфізікі склалі ядро кандыдацкай дысертацыі, якую ён паспяхова абараніў у 1939 годзе. Спіс яго навуковых работ зараз налічвае звыш 150 назваў.

Сваю навуковую работу на кафедры І. Р. Некрашэвіч цесна звязаў з навуковымі даследаваннямі лабараторыі электрафізікі фізіка - тэхнічнага інстытута АН БССР, якой ён кіруе.

На кафедры і ў адзначаных лабараторыях пад кіраўніцтвам І. Р. Некрашэвіча былі пачаты і атрымалі шырокае развіццё даследаванні па фізіцы з'яў, якія адбываюцца пры ўзаемадзеянні плазмы з паверхняй цвёрдых цел і якія маюць вялікае значэнне для фізікі і тэхнікі электрычных кантактаў, атамнага спектральнага аналізу, электраэразійнай апрацоўкі металаў, плазменнай апрацоўкі металаў, паўправаднікоў і дыэлектрыкаў, даследаванню ўласцівасцей паверхні цвёрдых цел, апрацаваных плазмай. У ходзе гэтых даследаванняў І. Р. Некрашэвічам сумесна з І. А. Бакуто была створана міграцыйная тэорыя электрычнай эрозіі металаў пры кандэнсіраваных электрычных разрадах. Ім, сумесна з аўтарам гэтых радкоў, прапанаваны і распрацаваны дыягнастычныя метады даследавання нестацыянарных працэсаў у плазме і пры кантакце плазмы з паўправаднікамі і металамі. Гэтыя работы садзейнічалі развіццю новага навуковага напрамку на кафедры: плазменных метадаў апрацоўкі паверхні прымяняльна да мікраэлектронікі. Даследаванні дадзенага напрамку ў рамках Беларусі каардынуюцца Навукова - тэхнічным Саветам па фізіцы і тэхніцы плазмы АН БССР, які ўзначальвае член- карэспандэнт АН БССР Л. І. Кісялеўскі. Секцыяй «Узаемадзеянне плазмы з паверхняй» кіруе І. Р. Некрашэвіч.

За час сваёй шматгадовай навукова - педагагічнай дзейнасці І. Р. Некрашэвіч выхаваў вялікую колькасць маладых спецыялістаў-фізікаў і радыёфізікаў.

За шматгадовую плённую навукова - даследчую дзейнасць ва універсітэце І. Р. Некрашэвіч у 1961 годзе быў узнагароджаны ордэнам Леніна, а ў 1972 годзе ўдастоены ганаровага звання заслужанага дзеяча навукі БССР.

У цяперашні час І. Р. Некрашэвіч працягвае плённа працаваць ва універсітэце, выконваючы свой высакародны абавязак педагога, вучонага.

**А. ЛАБУДА.**

# Шчаслівага шляху ў свет ведаў!

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).**

тэлектуальны ўзровень падрыхтоўкі, які дазваляе ім самастойна ставіць і вырашаць самыя складаныя задачы, падыходзіць крытычна да навуковых вынікаў і валодаць невычарпальнай творчасцю.

Універсітэцкая адукацыя асабліва каштоўна тым, што яна, як ніякая іншая, дазваляе спецыялісту хутка арыентавацца і знаходзіць сваё месца ў патоку бурнага навукова-тэхнічнага прагрэсу.

Зусім нядаўна я вярнууся з далёкіх Філіпін, дзе праходзіў VII кангрэс Міжнароднай асацыяцыі універсітэтаў. У ім прынялі ўдзел каля 600 рэктараў з самых розных універсітэтаў свету. Былі на ім і прадстаўнікі Савецкага Саюза. І вось з усіх выступленняў, з усіх прамоў нашы выступленні і даклады былі самымі пераканаўчымі, самымі грунтоўнымі. Але нам не верылі. Не верылі таму, што каля 75 працэнтаў нашых студэнтаў маюць стыпендыю, што такая ж колькасць жыве ў інтэрнатах.

Вы, першакурснікі, павінны памятаць, што іменна вы пераступіце парог XXI стагоддзя ў самым росквіце сваіх творчых сіл, іменна вы панясеце эстафету ведаў і інтэлектуальнага патэнцыялу нашага народа ў новы цудоўны і фантастычны век.

Паспяхова здаць уступныя экзамены, стаць студэнтамі БДУ, прадаўжаць лепшыя традыцыі універсітэта і памнажаць яго ролю ў развіцці навукі, культуры і мастацтва нашага народа — павінна быць запаветнай марай кожнага юнака і дзяўчыны, зрабіцца высакароднай мэтай іх жыцця.

Вы не пабаяліся ўсіх цяжкасцей, каб нарэшце стаць студэнтамі нашага універсітэта. Многія з вас, хто прысутнічае тут, маглі б паступіць у ВНУ іншым шляхам — больш лёгкім, гэта значыць, паступіць туды, дзе не трэба здаваць экзамены, але вы не здрадзілі сабе і выбралі цяжкасці.

Я хачу зараз, карыстаючыся выпадкам, сказаць вялікае дзякуй нашай роднай Камуністычнай партыі і савецкаму ўраду за той вялікі клопат і ўвагу, якую яны аказваюць універсітэтам. У БДУ ёсць усё, што неабходна для паспяховай вучобы, але ЦК КП Беларусі прыняў новае рашэнне аб паляпшэнні матэрыяльна-тэхнічнай базы нашага універсітэта.

Кожнаму з вас зараз трэба будзе шмат папрацаваць, перад вамі адкрываецца шырокае поле дзейнасці. Усе тыя спецыяльнасці, якія неабходны чалавецтву, вы абралі ў якасці сваіх будучых спецыяльнасцей. Гэта, безумоўна, выдатна.

Дазвольце ж мне выказаць упэўненасць, што ўсе вы захаваеце лепшыя традыцыі і памножыце іх. Шчаслівага шляху вам у гэты цудоўны і незабыўны свет ведаў, дзверы якога адчыняюцца перад вамі!

З увагай слухаюць першакурснікі сакратара партыйнай арганізацыі універсітэта А. П. Жука, які спыняецца на пытанні камуністычнага выхавання моладзі — адной з важнейшых задач савецкай вышэйшай школы.

БДУ імя У. І. Леніна захоўвае традыцыі, памятае сваіх герояў. Вось і зараз першакурснікі аддаюць даніну павагі тым, хто адстаяў шчасцемірна жыць і вучыцца — ускладаюць кветкі да падножжа мемарыяльнага Знака выкладчыкам і студэнтам універсітэта, якія загінулі ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Цёплымі словамі вітаюць юнакоў і дзяўчат прафесар філфака народны паэт Беларусі А. А. Лойка, загадчык кафедры тэорыі верагоднасцей Г. А. Мядзведзеў, сакратар камсамольскай арганізацыі БДУ П. І. Брыгадзін, студэнт V курса геаграфічнага факультэта Л. Гайдукевіч. На сцэну ўносіцца сімвалічны ключ да ведаў, які ўручаюць новаму папаўненню лепшыя студэнты-пяцікурснікі — сакратары камсамольскіх арганізацый біяфака Н. Няхайчык і факультэта радыёфізікі і электронікі А. Чулкоў, намеснік сакратара камітэта камсамола мехмата В. Кошалева.

І апошняе — клятва. Яна гучыць урачыста і цвёрда — клятва на вернасць выбранаму шляху, будучай прафесіі і пачатку цікавага і запамінальнага пяцігадовага падарожжа ў студэнцкую краіну ведаў.

**І. ШУКЕВІЧ,**
**В. МАСКАЛЁЎ (фота).**

**ФОТАРЭПАРТАЖ З ПАСВЯЧЭННЯ ПЕРШАКУРСНІКАЎ У СТУДЭНТЫ**

● ВЫСТАЎКІ

# ТВОРЧАСЦЬ МАЛАДЫХ

110-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна і 60-годдзю Ленінскага камсамола Беларусі прысвечана Рэспубліканская выстаўка навукова - тэхнічнай творчасці моладзі «НТТМ-80». На ёй камсамол рэспублікі падводзіць вынікі сваёй пяцігадовай дзейнасці па выкананню рашэнняў XXV з'езда КПСС і XVIII з'езда ВЛКСМ аб павышэнні эфектыўнасці грамадскай вытворчасці і паскарэнні навукова - тэхнічнага прагрэсу.

27 работ, выкананых супрацоўнікамі, выкладчыкамі, студэнтамі фізічнага і хімічнага факультэтаў, супрацоўнікамі НДІ ФХП і НДІ ПФП БДУ імя У. І. Леніна, прадстаўлены на выстаўцы.

Вялікую цікавасць выклікае лічбавы радыёізатопны платнамер, зроблены супрацоўнікамі кафедры ядзернай фізікі А. Аншаковым і У. Чудаковым, вымяральнік характарыстык імпульсаў. прадстаўлены супрацоўнікамі кафедры агульнай фізікі С. Вятохіным і В. Буцкім, бессярэбраныя і маласярэбраныя фотаматэрыялы, распрацаваныя супрацоўнікамі НДІ ФХП і хімічнага факультэта, іншыя работы. 6 экспанатаў прадстаўлена студэнтамі фізічнага і хімічнага факультэтаў. Сярод іх — вучэбны электрастатычны генератар, створаны студэнтам фізфака А. Паповым. Прылада дазваляе наглядна дэманстраваць шэраг цікавых вопытаў па электрастатыцы і разрадах у газах.

**А. ВАЛАТО,**
**студэнт журфака.**

# ЦУДОЎНАЕ ЛЕТА

Бадзёрыя, у добрым настроі, пасля летняга адпачынку прыступілі да заняткаў замежныя студэнты, якія займаюцца ў БДУ імя У. І. Леніна.

З Гвінеі і Кубы, В'етнама і Йемена, Іарданії і Лаоса, Афганістана і Грэцыі, Сальвадора і іншых рэспублік свету адпачывалі хлопцы і дзяўчаты ў нашай краіне.

33 чалавекі ў ліпені-жніўні былі ў доме адпачынку на возеры Нарач, 15 чалавек прымалі ўдзел у экскурсіі Мінск—Ерэван—Адэса, 22—ездзілі аўтапоездам «Дружба» ў Азербайджан, чацвёра папраўлялі сваё здароўе ў санаторыі «Есентукі», які размешчаны на Паўднёвым беразе Крыма, 8 чалавек у пансіянаце «Адлер».

Але рабяты там не толькі адпачывалі, яны актыўна ўдзельнічалі ў мастацкай самадзейнасці, спорце, навуковых канферэнцыях. Шмат разоў ездзілі на экскурсіі. Напрыклад, тыя хто быў у «Адлеры», наведалі Сухумі, возера Рыцу, Піцунду.

**М. ЦІТОЎ,**
**старшы інспектар па рабоце з замежнымі навучэнцамі.**

● ПАРТЫЙНАЯ АДУКАЦЫЯ

# І СЛОВАМ, І СПРАВАЙ

ПАЧАЛІСЯ ЗАНЯТКІ ў сістэме партыйнай адукацыі. Выкладчыкі БДУ імя У. І. Леніна —слухачы філіяла універсітэта марксізму-ленінізму пры Мінскім абкоме КПБ—сабраліся ў вялікай аўдыторыі геаграфічнага корпуса, каб падвесці вынікі вучобы мінулага года.

Дэкан філіяла, дацэнт кафедры філасофіі гуманітарных факультэтаў Анатоль Ізотавіч Зелянкоў расказаў аб задачах, якія стаяць перад слухачамі універсітэта марксізму-ленінізму, пазнаёміў іх з вучэбнай праграмай. Ён адзначыў, што сёлетні вучэбны год — асаблівы. Гэта год падрыхтоўкі да XXVI з'езда КПСС, таму вучоба і самастойная работа слухачоў будзе зыходзіць менавіта з гэтага. Лекцыі па актуальных праблемах тэорыі палітыкі КПСС, па марксісцка-ленінскай філасофіі і крытыцы буржуазнай філасофіі, па асновах навуковага камунізму, сацыяльнай псіхалогіі і іншых дысцыплінах будуць чытаць вопытныя выкладчыкі, такія, як кандыдаты філасофскіх навук Г. П. Ляўко, А. І. Мішук, В. Я. Бянькоўскі і інш.

Затым А. І. Зелянкоў звярнуў увагу слухачоў на неабходнасць пастаяннай работы над сабой. Яна павінна стаць тым імпульсам, які садзейнічае далейшаму выхаванню ідэйнай свядомасці, высокай палітычнай актыўнасці, становіча ўздзейнічае на светапогляд чалавека, на яго мысленне і паводзіны.

Загадчык філіяла па Маскоўскаму раёну А. В. Какурын уручыў слухачам І курса заліковыя кніжкі.

Вучоба разлічана на 2 гады. За гэты час слухачы павінны засвоіць пэўны аб'ём ведаў па розных дысцыплінах. Але самае галоўнае—яны павінны стаць ідэйна перакананымі, каб усе свае веды накіроўваць на выхаванне чалавека новага, камуністычнага грамадства.

**А. ЛАЗОЎСКІ,**
**В. МАСКАЛЁЎ.**
**Фота аўтараў.**





# НАРОДНЫ СКАРБ

**Амаль два месяцы мінула з таго часу, як скончылася фальклорная практыка студэнтаў. Надоўга застануцца ў памяці філолагаў-першакурснікаў гэтыя два тыдні ў чэрвені. Першыя сустрэчы са старажыламі, упершыню пачутыя песні і прымаўкі, казкі і частушкі. Сабіраць жа ўсё гэта даводзілася па кроплі, і ў самых глухіх вёсачках Беларусі. Бо там можна пачуць вясельныя і калядныя песні, убачыць народныя абрады.**

У вёску Пярэдзілка Гомельскай вобласці Люда Новік са сваімі аднакурснікамі прыехала 2 чэрвеня. Стомленыя пасля доўгай дарогі, рабяты так і думалі дзе б ім адпачыць. Тыя гасціннасць і дабрадушнасць, з якімі іх сустрэлі мясцовыя жыхары, асабліва дзеці, адразу ж узнялі настрой.

— Пасля таго, як уладкаваліся па кватэрах, адразу ж прыступілі да працы, — гаворыць Люда. — І ў многім дапамагла мне мая гаспадыня Хадора Паўлаўна Анікеенка. Бабуля, якой ужо 80 гадоў, вельмі цікава расказала пра мінулае вёскі, аб тым, што раней тут быў маёнтак графіні Бараноўскай. Як толькі яна эмігрыравала за мяжу, у замку была створана школа. Шырокая брукаваная дарога вядзе да яе, а паабапал — ліпавая алея. Каля школы парк. Растуць у ім магутныя дрэвы, якія рэдка сустрэнеш у лясах Беларусі. Побач маладзенькія бярозкі, якія пасадзілі школьнікі на месцы высечаных дрэў. Чаму высечаных?

— Гэта было даўно, — расказвае Хадора Паўлаўна. — Яшчэ ў вайну. Тады ў нашай вёсцы было шмат гітлераўцаў. Яны будавалі масты праз Днепр. Будавалі іх з тых дрэў, што раслі ў парку. Сэрца сціскалася ад болю, калі хто бачыў гэты жудасны малюнак. Нібы скошаныя, адно за адным валіліся на зямлю спілаваныя дрэвы. А яны смяяліся, радуючыся таму, што хутка і зручна будаваць з гэтых вялізных дрэў...

— А чаму вёска так называецца?

— Калі была ўстаноўлена Савецкая ўлада і пачалі дзяліць зямлю, вёску так і назвалі «Перадзеланыя землі», потым скарацілі ў «Перадзелаўку», а зараз, як вы ўжо ведаеце, завуць яе «Пярэдзілка». Мо, каб карацей было казаць, а, мо ўжо і не памятаюць першай назвы вёскі...

Шмат цікавага расказала яна дзяўчыне. Потым праспявала некалькі песен, якія Люда запісала на магнітную стужку. Параіла да каго можна звярнуцца на наступны дзень.

Але ў той дзень нічога цікавага запісаць так і не давялося. Дзяўчаты заходзілі амаль у кожны дом. І ўсюды іх чакаў адзін і той жа адказ: «Мы нічога не ведаем, ідзіце да каго іншага». І яны ішлі, і не гублялі надзеі на тое, што на гэты раз ім абавязкова пашанцуе, іх зразумеюць. Не запісаўшы нічога цікавага ў адной вёсцы, ішлі ў другую. І вось аднойчы трапілі ў вёску Суткоў.

...Дзяўчаты зайшлі ў сенцы адной з хат і нясмела пастукалі ў дзверы. Насустрач выйшла бабуля. Яна запрасіла іх у пакой, потым уважліва выслухала і згадзілася дапамагчы. Калі ж Люда ўключыла магнітафон, бабуля на нейкі момант разгубілася, але потым, узяўшы сябе ў рукі, пачала спяваць. Часам песня перарывалася, але яна тут жа прасіла прабачэння, маўляў, даўно не спявала, трохі пазабывалася, і зноў пачынала пець...

На чацвёрты дзень Люда і Сярожа, яе аднакурснік, пайшлі ў вёску Барэц. Падышоўшы да аднаго дома, яны заўважылі ў агародзе жанчыну, якая, схіліўшыся над градой, палола. Расказала і ёй дзяўчына, чаго завіталі ў гэту далёкую вёску. Не магла тая адмовіцца, бо больш як за 10 кіламетраў у такую спякоту ішлі, каб запісаць песню. І Таццяна Мікалаеўна Мельнік, так яе звалі, не кідаючы сваёй працы, пачала спяваць. Спявала прыгожа. Закончыўшы сваю працу, жанчына запрасіла рабят у хату. Расказала аб сабе, аб тым, што яна спявала ў хоры. Паказала фотаздымкі, дзе яна сфатаграфавана з сяброўкамі ў нацыянальных касцюмах...

Потым дзяўчыне стала шанцаваць. То ў адной, то ў другой вёсцы сустракала тых, хто мог спець, расказаць нешта цікавае. Дапамагалі ёй і мясцовыя дзяўчаты. Напрыклад, Таня Гайдукевіч з Рудне-Каменева, на кацеры праз Днепр адвезла яе у сваю вёску. Там сабрала сваякоў і разам з імі пачала спяваць. Яна ад усяго сэрца імкнулася дапамагчы Людзе, з якой яны так пасябравалі...

Неяк сустрэлася дзяўчына яшчэ з адным цікавым чалавекам. Завуць яго Ілья Дзямідавіч Хохаў, якому больш як 80 гадоў. Ён піша вершы, ведае шмат казак, цікавых гісторый. Расказвае ў сваіх вершах аб гераізме савецкіх людзей у час вайны, аб нашай сучаснасці. Але больш за ўсё ўразіла дзяўчыну тое, што і размаўляе ён так, нібы новы верш складае. Усё ў яго неяк у рыфму атрымоўваецца...

Цяжка вылучыць лепшае з таго, што запісала Люда Новік у час практыкі. У кожнай песні, прымаўцы, казцы адчуваецца цеплыня і пяшчота, душэўнасць і шчодрасць народа. І наша задача захаваць гэты духоўны скарб будучым пакаленням.

**Н. ЖУКАВА.**

**ЛЕТНЯЯ ПРАКТЫКА. ЦІКАВАЯ І КАРЫСНАЯ, ЯНА ШМАТ ДАЕ СТУДЭНТАМ УНІВЕРСІТЭТА. ПЕРШЫЯ АДКРЫЦЦІ Ў ЧАС ЯЕ І ПЕРШЫЯ ЗНАЁМСТВЫ НАДОЎГА ЗАСТАНУЦЦА Ў ПАМЯЦІ БУДУЧЫХ ФІЛОЛАГАЎ І ЖУРНАЛІСТАЎ, ГІСТОРЫКАЎ І ГЕОГРАФАЎ...**

# НОВЫЯ АДКРЫЦЦІ

ПЯТЫ ГОД студэнты гістарычнага факультэта пад кіраўніцтвам выкладчыкаў кафедры археалогіі, этнаграфіі і дапаможных гістарычных дысцыплін працягваюць археалагічныя раскопкі невядомага па пісьменных крыніцах умацаванага пасялення эпохі Кіеўскай Русі каля вёскі Вішчын у Рагачоўскім раёне Гомельскай вобласці. Размешчанае на высокім правым беразе Дняпра, яно да цяперашняга часу ўражвае сваёй магутнай сістэмай добра захаваўшыхся земляных умацаванняў, якія апярэзваюць трымя кольцамі насыпаў невялікую пляцоўку, на якой у XI — пачатку XII стагоддзя ўзнік моцны феадальны замак.

Два гады назад на ўзвышшы былі адкрыты рэшткі згарэўшай драўлянай сцяны, пад якой мінулым летам быў знойдзены схаваны ў сярэдзіне XII стагоддзя унікальны скарб залатых і сярэбраных упрыгожванняў разам з грашовымі сярэбранымі зліткамі — грыўнамі. Падобнага скарбу яшчэ ні разу не знаходзілі на тэрыторыі Беларусі. Асобныя яго рэчы мелі дакладныя аналогіі ў кіеўскіх, разанскіх і іншых скарбах, якія былі зарыты ў перыяд татара-мангольскага нашэсця на Русь. Прадстаўленыя ў ім цудоўныя жаночыя ўпрыгожванні — колты з чэрню і перагародчатай эмаллю традыцыйна лічыліся прадукцыяй кіеўскіх княжацкіх майстэрань. Аднак у гэтым годзе ў Вішчыне давялося раскапаць рэшткі майстэрні ювеліра, у якой была знойдзена цэлая медная матрыца колта з выразаным на ёй адлюстраваннем крылатага грыфона. Выцесненыя на ёй залатыя ці сярэбраныя пласціны для катлоў павінны былі пакрывацца эмалямі. Гэта першая на тэрыторыі заходніх зямель Русі верагодная знаходка, якая сведчыць аб існаванні мясцовага рамяства, знаёмага з самай дарагой і складанай вытворчасцю — эмалямі.

Значыць, у феадальным замку разам са знатным баярынам і цяжкаўзброенымі воінамі-рыцарамі жыў ювелір, прадукцыя якога, відавочна, знаходзіла збыт сярод рускай знаці далёка за межамі дадзенага пасялення. І гэта прымушае па-новаму глядзець на характар феадальнага замка ў цэлым.

Вялікая калекцыя старажытнай зброі папоўнілася ў гэтым годзе знаходкамі бронзавых частак ад рукаяткі мяча. Дэталі ўпрыгожаны гравіроўкай і філігранню.

Было прадоўжана даследаванне крапаснай сцяны. У адной гаспадарчай яме быў знойдзены цэлы гліняны гаршчок з рэшткамі расліннасці.

Другая група студэнтаў пачала раскопкі курганнага магільніка XI— XII стагоддзяў каля вёскі Юдзічы ў тым жа Рагачоўскім раёне. Раскапана 10 курганоў. Многія захараненні напоўнены вялікай колькасцю рэчаў — глінянымі сасудамі, бронзавымі упрыгожваннямі, шклянымі пацеркамі.

Па матэрыялах раскопак 1980 года студэнты-археолагі будуць пісаць курсавыя і дыпломныя работы, выступаць з дакладамі і паведамленнямі на пасяджэннях гуртка і навуковых студэнцкіх канферэнцыях.

Усе рэчы з'яўляюцца добрым папаўненнем фондаў гістарычнага музея БДУ і хутка будуць экспанавацца ў зале археалогіі.

**Э. ЗАГАРУЛЬСКІ,**
**загадчык кафедры археалогіі, этнаграфіі і дапаможных гістарычных дысцыплін.**

# Станцыя «Заходняя Беразіна»



З ГОДУ ў год студэнты ўсіх курсаў геаграфічнага факультэта замацоўваюць тэарэтычныя веды на вучэбных і вытворчых практыках. Пасля першага і другога курсаў яны праводзяць палявыя даследаванні на вучэбнай станцыі «Заходняя Беразіна» Валожынскага раёна Мінскай вобласці. Пад кіраўніцтвам вопытных выкладчыкаў дацэнтаў В. С. Аношка, Р. А. Жмойдзяка, Б. А. Мядзведзева, старшых выкладчыкаў Р. У. Жаевіч і Н. А. Гяцэвіч атрымоўваюць навыкі па тапаграфіі, глебазнаўству, геалогіі і метэаралогіі. На другім курсе дацэнты Г. М. Базыленка, Г. І. Марцынкевіч, А. М. Матузка, старшыя выкладчыкі і асістэнты знаёмяць студэнтаў з асновамі палявых даследаванняў па курсах геамарфалогіі, гідралогіі, батаніцы, комплексных фізіка- і эканоміка-геаграфічных даследаванняў, комплекснай геаграфічнай практыкі па дальняму маршруту.

На вучэбнай базе дзейнічаюць інтэрнаты, сталовая, якія пабудаваны рукамі студэнтаў. «Геаграфічная вёска» адначасова можа прыняць да 300 студэнтаў стацыянара, вячэрняга і завочнага факультэтаў.

Адначасова з добраўпарадкаваннем базы ствараюцца вопытныя пляцоўкі, вучэбныя станцыі і пасты. Правядзенне стацыянарных даследаванняў сумесна з практыкай максімальна набліжае будучых даследвальнікаў да педагагічнай, навукова-даследчай, вытворчай работы. Для гэтай мэты вядучымі выкладчыкамі своечасова аднаўляюцца праграмы, распрацоўваюцца метадычныя дапаможнікі. На жаль, «Вучэбны дапаможнік па вучэбных практыках на станцыі «Заходняя Беразіна» ўжо не адпавядае сучасным патрабаванням. Неабходна яго далейшая дапрацоўка і перавыданне. Патрабуецца абсталяванне апорных разрэзаў і свідравін па курсах геалогіі, геамарфалогіі і гідралогіі, абнаўленне палявых лабараторый і вучэбнай бібліятэкі.

У перыяд вучэбных практык студэнты вывучаюць сучасныя прыборы і метады палявых даследаванняў, набываюць навыкі складання тапаграфічных карт, справаздач па матэрыялах самастойных даследаванняў. На вучэбных практыках шмат увагі ўдзяляецца пытанням практычнага выкарыстання вынікаў даследаванняў. Студэнты самастойна даюць эканамічную ацэнку прыродных і працоўных рэсурсаў аб'екта даследаванняў, практычныя рэкамендацыі па сучаснаму і перспектыўнаму іх выкарыстанню. Многія складзеныя агульнагеаграфічныя і мэтавыя карты могуць быць выкарыстаны гаспадаркай на практыцы.

Спалучэнне працы і адпачынку—умова паспяховага правядзення практык. Сталі традыцыйнымі вечары каля вогнішча, агляды мастацкай самадзейнасці паміж курсамі, спартыўныя гульні і спаборніцтвы. Вялікую работу ў гэтым напрамку на вучэбнай станцыі праводзіць старшы выкладчык А. С. Ішчанка. Аднак на станцыі адчуваецца недахоп спартыўнага інвентару, не зусім у добрым стане спартыўныя пляцоўкі і футбольнае поле.

Завяршаюцца вучэбныя практыкі комплекснай геаграфічнай практыкай па дальніх маршрутах. На працягу 21 дня студэнты маюць магчымасць вывучаць асаблівасці прыроды і эканоміку раёнаў і гарадоў у розных кутках нашай краіны (Каўказ, Урал, УССР, рэспублікі Прыбалтыкі, раёны севера Еўрапейскай часткі СССР). Практыка мае маршрутны характар, што дазваляе студэнтам пазнаёміцца з тэхналогіяй вытворчасці і праверыць веды па агульнаадукацыйных курсах.

Лепшыя студэнты геаграфічнага факультэта маюць магчымасць пасля II курса прайсці вытворча-азнаямленчую практыку за мяжой. Неаднаразова студэнты геафака наведвалі Балгарыю, Венгрыю, Чэхаславакію і Югаславію.

Пастаянную павагу да прыроды імкнуцца прывіць выкладчыкі геаграфічнага факультэта будучым спецыялістам - географам. Яна фарміруецца ў студэнтаў у працэсе чытання лекцый, правядзення заняткаў і, вядома, на практыках.

**П. ЛОПУХ,**
**асістэнт кафедры агульнага землязнаўства.**





Збылася мара Алены Шакун — яна стала студэнткай факультэта прыкладной матэматыкі Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна.

Фота В. Маскалёва.

ШЧЫРЫ МАНАЛОГ

# «БУЛЬБА» АПОШНЯЯ...

БЫЛА ВОСЕНЬ, месяц верасень. Быў пачатак звычайнай студэнцкай «бульбы». І адчуў я, што для мяне яна апошняя — чацвёртая. І ўявіў я яе незвычайнай і асаблівай. Такой, якой была самая першая — у невялікай вёсцы Вераньці, што на Віцебшчыне. І ўявілі яе так сябры мае — аднакурснікі. Уявілі яшчэ задоўга да таго моманту, калі апынуліся ў Магілёўскай вобласці, Клімавіцкім раёне, у саўгасе з мілагучнай назвай «Савінічы». Апынуліся ў гаспадарцы, якой спатрэбілася наша дапамога. Дапамога студэнтаў чацвёртага, трацяга і другога курсаў факультэта журналістыкі Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна. Дарэчы, гэтаму і адпавядае назва нашага сельскагаспадарчага атрада — «432». Назва, якая сімвалізуе нашу згуртаванасць, наша студэнцкае сяброўства. А яно, гэтае сяброўства, нараджаецца менавіта тут, на «бульбе». Так было, ёсць і будзе заўсёды. Як ёсць заўсёды ў кожнага студэнцкага атрада, ці то будаўнічага, ці то сельскагаспадарчага, свой камандзір, чалавек, якому давяраюць, з якім раяцца. І чалавек гэты павінен апраўдваць давер'е калектыву, як апраўдвае яго камандзір нашага ССГА Валянцін Лапікаў. Яго паважаюць, да яго цягнуцца ў атрадзе. І зразумела гэта стала на першым жа камсамольскім сходзе, дзе вырашаліся розныя пытанні. А іх было шмат: дзе жыць, харчавацца, што ад нас патрабуюць у саўгасе, нават, дзе знайсці радыёлу, каб вечарамі слухаць музыку, танцаваць ці праводзіць імправізаваныя дыскатэкі і шмат чаго іншага. І калі ўсе яны былі вырашаны, пачалася, пайшлі сваёй няспыннай чаргой дні, запоўненыя клопатамі і працоўнымі здзяйсненнямі.

Спачатку ўвесь атрад працаваў на зернетаку. У дзве змены. Раніцай і вечарам. Потым знайшлася дадатковая работа. І разам з ёю з'явілася некалькі груп, якія працавалі і на пагрузцы саломы, і на сеялцы, і на сіласаванні. Але галоўнай нашай справай заставалася праца на бульбяных палетках. Бо сёлета ў саўгасе «Савінічы» нашаму ССГА трэба ўбраць бульбу з плошчы 150 гектараў. Так запісана ў прынятых намі сацыялістычных абавязацельствах. Так абавязкова і будзе. Бо толькі за першыя два тыдні атрадам накапана звыш 350 тон бульбы. А час яшчэ ёсць, ды і надвор'е не дае сумаваць. І асабліва тым, хто заўсёды наперадзе: Аляксею Верушу, Галіне Сачанка, Ірыне Гусько, Аляксандру Слабадчуку... А калі гаварыць пра адпачынак, то спіс гэты можна пашырыць значна. Бо атрадам ужо праведзены канцэрт мастацкай самадзейнасці для жыхароў саўгаса, які з вялікім поспехам прайшоў у памяшканні мясцовай школы.

Актыўна дзейнічае лекцыйная група, якую ўзначальвае другакурсніца Таццяна Сапач, наладжана шэфская дапамога, адкрыты і пасляхова працуюць танцавальны і фотагурткі. Сыграны адзін матч па футболу з мясцовай камандай. Усяго і не пералічыць. Ды і навошта. Калі вам захочацца даведацца больш, то прыязджайце да нас у атрад. Калі ласка! Не пашкадуеце.

С. ЛЫСКАВЕЦ,
баец ССГА факультэта журналістыкі.

# ЗВАРОТ

## БАЙЦОЎ ССГА «РЫТМ» ФІЗІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА ДА ЎСІХ ССГА БДУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

Прызыўным, натхняючым святлом знамянальнай падзеі — XXVI з'езда КПСС — асвечаны будні савецкіх людзей. Сэрцам успрыняўшы Пастанову ЦК КПСС «Аб сацыялістычным спаборніцтве за дастойную сустрэчу XXVI з'езда КПСС», байцы ССГА «Рытм» прымаюць на сябе павышаныя сацыялістычныя абавязацельствы і заклікаюць усе сельскагаспадарчыя атрады БДУ імя У. І. Леніна разгарнуць спаборніцтва пад дэвізам «XXVI з'езду КПСС — 26 ударных вахт на ўборцы ўраджаю 1980 года».

ССГА «Рытм» абавязуецца:

**— выконваць норму штодзённа на 150 працэнтаў. Берагчы кожную рабочую хвіліну, не дапускаць страт ураджаю, прытрымлівацца правілаў тэхнікі бяспекі;**

**— выконваючы свой асноўны абавязак перад тымі, хто паў у баях за свабоду і незалежнасць нашай Радзімы, ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны, прыняць самы актыўны ўдзел у аперацыях «Салдацкі ліст», «Памяць»; адшукаць не менш 2 салдацкіх лістоў ваеннага перыяду, запісаць успаміны 6 воінаў — ветэранаў і працаўнікоў тылу, аказаць шэфскую дапамогу 10 сем'ям загінуўшых і ветэранаў вайны і працы;**

**— узяць шэфства над мясцовай школай, прачытаць для вучняў выпускных класаў не менш трох лекцый аб БДУ імя У. І. Леніна, іншых навучальных установах г. Мінска, правесці ў кожным класе ўрок мужнасці і геранізму, прысвечаны 60-годдзю камсамола Беларусі;**

**— устанавіць цесную сувязь з мясцовай камсамольскай арганізацыяй, правесці гутаркі з маладымі рабочымі гаспадаркі аб умовах прыёму на падрыхтоўчае аддзяленне БДУ імя У. І. Леніна, арганізаваць рэйд «Камсамольскага пражэктара» па папярэджанню страт ураджаю, арганізаваць работу атэлье «Дзякуй» па рамонту бытавой тэхнікі;**

**— правесці з найвышэйшай прадукцыйнасцю дзень ударнай працы;**

**— прачытаць не менш як 4 лекцыі на кожнага лектара атрада па рознай тэматыцы;**

**— арганізаваць не менш як 5 выступленняў агітбрыгады атрада перад працаўнікамі сельскай гаспадаркі ў клубах, на зернетаках і ў полі;**

**— весці актыўную прапаганду студэнцкіх сельскагаспадарчых атрадаў, пастаянна асвятляць выкананне сацыялістычных абавязацельстваў у насеценым і перыядычным друку.**

Байцы студэнцкага сельскагаспадарчага атрада «Рытм» поўныя рашучасці выканаць узятыя высокія сацыялістычныя абавязацельствы і дастойна сустрэць XXVI з'езд КПСС.

Зварот абмеркаваны і прыняты на агульным сходзе атрада.

## АДРАСЫ ЎДАРНЫХ СПРАЎ

Студэнты Белдзяржуніверсітэта накіраваны на сельгасработы ў 5 раёнаў Магілёўскай вобласці:

Чавускі раён: **механіка-матэматычны і біялагічны факультэты;**

Шклоўскі раён: **факультэт прыкладной матэматыкі і геаграфічны факультэт;**

Круглянскі раён: **гістарычны і філалагічны факультэты;**

Быхаўскі раён: **фізічны і юрыдычны факультэты;**

Клімавіцкі раён: **хімічны факультэт, факультэт радыёфізікі і электронікі і факультэт журналістыкі.**

Агульная колькасць байцоў студэнцкіх сельскагаспадарчых атрадаў універсітэта — **3697 чалавек.**

# ШТРЫХІ ДА ВОСЕНІ

ГАЛІНКІ ЯБЛЫНЬ схіліліся да самай травы, густой і роснай ад туману. Здавалася, што плады кожнага дня багатага, але на жаль ужо прайшоўшага, лета. Восень падышла непрыкметна і баязліва апляла павуцінкамі дрэвы, перакрэсліла выцвіўшае неба пункцірамі адлятаючых птушыных чарод, напаіла ночы водарам спелай антонаўкі.

У вёску Шчорсы Гродзенскай вобласці, куды нас накіравалі на ўборку яблык, мы прыехалі вечарам. У апошні раз аўтобусы выдыхнулі бензінавы гар і зніклі за паваротам дарогі. Мы засталіся адны, пакуль незнаёмыя між сабой, крыху ўсхваляваныя прыездам. Было прыгожа. І старынная сядзіба, дзе мы пасяліліся, і ланцужок сажалак са схіленымі вербамі на берагах, і сталетні дуб...

Працаваць пачалі з самага ранку. Наша група, у складзе 57 чалавек нібы растваралася ў вялікім садзе. Спачатку работа, не ладзілася. Вёдры трымалі ў руках, яблыкі цяжкавата было даставаць. Пасыпаліся рацпрапановы. І хутка патрэбны рытм ужо адчуваўся. Яблыкі асцярожна апускалі ў вёдры, якія віселі на спецыяльна зробленых кручках на лесвіцы, скрынкі для яблык усцілалі саломай.

Работа, знаёмствы, нават спаборніцтва: больш, хутчэй, лепш. Так, за працай, за размовамі і жартамі надышоў вечар. Пахаладала. Каля сажалкі распалілі вогнішча. У цёмным небе дым растваруўся, разам з ім знікла і адчужанасць. Стала цяплей і ўтульней. Завязаліся новыя гутаркі. А потым пачулася песня...

Непагодлівыя дні, халодная маўклівасць Нёмана — усё забываецца. Застаецца пах налітых спеласцю антонавак, чыстае паветра і цепліня новых знаёмстваў.

**А.САЛЬНІКАВА,**
**студэнтка журфака.**

СА СТУДЭНЦКІМ АГЕНЬЧЫКАМ, штодзённа перавыконваючы нормы выпрацоўкі, працуе кожны баец ССГА «Удачнік» факультэта прыкладной матэматыкі ў саўгасе «Рабочы». За прайшоўшыя дні байцы атрада паднялі і адсартавалі больш як 10 тон ільнотрасты, выбралі і ачысцілі 130 тон буракоў і 25 тон морквы, выконвалі работы на зернетаку і сяўбе азімых. Праведзена вялікая работа па добраўпарадкаванню лагера атрада.

ШКЛОЎСКІ РАЁН

# На крылах спаборніцтва

У план работы атрада ўключана шэфская дапамога школе, ветэранам вайны і працы, лекцыйная прапаганда перад школьнікамі і рабочымі саўгаса, правядзенне палітінфармацый, сумесных мерапрыемстваў з камсамольскай арганізацыяй гаспадаркі, выпуск «маланак», баявых лісткоў, сценгазет. Агітбрыгада атрада дасць не менш як 5 канцэртаў для сельскіх працаўнікоў.

Байцы атрада звярнуліся з заклікам да ўсіх студэнтаў і навучэнцаў, якія працуюць на палях Шклоўскага раёна:

«Давайце працаваць так, каб кожны баец атрада выконваў не менш паўтары нормы ў дзень. Няхай кожны з нас стане прыкладам камуністычных адносін да працы, добрасумленнай работы на карысць нашай Радзімы. Шырэй разгорнем сацыялістычнае спаборніцтва, масава - палітычную, унутрыатрадную, культурнамасавую работу сярод мясцовага насельніцтва ў гонар 60-годдзя ЛКСМБ».

**Н. ПЯТРОВА.**

КЛІМАВІЦКІ РАЁН

# З творчым уздымам

УДАРНАЯ ВАХТА на палях рэспублікі працягваецца. Зараз вельмі важна хутка і без страт убраць вырашчаны ўраджай. Байцы лінейнага студэнцкага атрада імя Дзмітрыя Іванова 1—2 курсаў факультэта журналістыкі БДУ імя У. І. Леніна, ідучы насустрач XXVI з'езду КПСС, імкнуцца азнаменаваць сельскагаспадарчыя работы ўдарнай працай, працай па-ленінску. Студэнты аказваюць дзейсную дапамогу на ўборцы льну, бульбы, караняплодаў і іншых сельскагаспадарчых культур калгасу «Серп і молат», штодзённа выконваюць і перавыконваюць на 10—15 працэнтаў устаноўленую норму выпрацоўкі, актыўна ўдзельнічаць у грамадска-палітычнай рабоце сярод насельніцтва гаспадаркі; шэфствуюць над ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны і працы, сем'ямі загінуўшых.

У атрадзе рэгулярна падводзяцца вынікі сацыялістычнага спаборніцтва, выпускаюцца баявыя лісткі, «маланкі», праводзяцца палітінфармацыі. Будучыя журналісты дапамагаюць калгасу, сельскаму клубу і бібліятэцы ў афармленні наглядной агітацыі.

**Н. КЛІМАВА.**

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

2 кастрычніка 1980 г.

АТ 15402 Заказ 1471

220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14. ТЭЛЕФОН 22-07-19

Рэдактар В. П. ВАРАБ'ЁЎ